## ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**Ю. Баглай**

### БЕЛАРУСКІ АРНАМЕНТ: АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНЫХ ДЗЁН

Адным з яскравых помнікаў нашай беларускай нацыянальнай культуры з'яўляецца мастацтва вышывання і адпаведна – вышытыя вырабы, якія могуць з гонарам лічыцца часткай нашай народнай спадчыны. Беларускі арнамент змяшчае вялікую колькасць узораў, якія маюць сваю мову і сваю гісторыю.

Арнаментам (ад лац. *ornamentum* – упрыгожванне) называецца ўзор, які характарызуецца рытмічным раскладам элементаў.

Чалавек з даўніх часоў упрыгожвае арнаментамі розныя прадметы: посуд, зброю, мэблю, архітэктурныя збудаванні і г.д. Акрамя чыста эстэтычнай функцыі, арнамент традыцыйна нясе інфармацыю пра ўладальніка, а раней выконваў і ролю талісмана, напрыклад, абярэга ад злых сіл.

Традыцыйны геаметрычны арнамент беларускай народнай вышыўкі, як і арнамент іншых усходнеславянскіх народаў, не вызначаўся асаблівай разнастайнасцю састаўных элементаў. Яго асноўнымі фігурамі былі ромбы, квадраты, крыжы, разеткі, зоркі, трохвугольнікі, прамыя і ламаныя лініі.

Вобразы прыродных з'яў займаюць значнае месца сярод беларускіх арнаментаў. Так Неба, Сонца, Зямля і Агонь сустракаюцца больш за 36 разоў. Кожны з іх па-свойму ўнікальны і непаўторны.

Цэнтральнае месца сярод арнаментаў займае Зямля-карміцелька. У аснове арнамента, які ўвасабляе мары і надзеі беларуса-земляроба, – успрыманне Зямлі як цэнтра космасу, знаходзіцца ромб.

Для абазначэння сонейка выкарыстоўваюцца два сімвалы: Сонца і Свет. Усяго арнаментаў 11. Звычайна выкарыстоўваюць узор, скампанаваны з квадратаў і кругоў, што сімвалізавала сонца і зямлю. Існавалі таксама матывы ракі (папярэчныя палосы, якія нагадваюць рабізну на вадзе), вады (быццам кругі на вадзе, але складзеныя з прамавугольных цаглінак), лесу, дубровы (звычайна некалькі радоў пазнавальных матываў магутных дрэваў), поля, лугу (кветкі ўсіх магчымых колераў), жывёл, птушак.

Каб выказаць ідэю росквіту прыроды, жыцця, вышываюць сімвал Сонца, які змяшчаецца ў сімвал Зямлі. Гэты ўзор шырока вядомы ў беларускім ткацтве. Калісьці яго можна было ўбачыць у кожнай сялянскай хаце, паколькі ён лічыўся цудадзейным. Называюць яго па-рознаму: Жыццё, Вясна, Ярыла.

У тканых і вышываных арнаментах вобраз Маці сустракаецца ў трох варыянтах: жаночай фігуры, абмаляванай гірляндаю зоркі і ў выглядзе схематычнага дрэва. Нярэдка вобраз суправаджаўся сімваламі сонца, месяца, агню, ветру, што падкрэслівала раўназначнасць гэтых вобразаў. Вобразы чалавека, сям'і, дзяржавы. Сімвал чалавека – васьміканцовая зорка – адзін з самых

пашыраных сімвалаў у беларусаў. Бярозка ці рабіна – вобраз дзяўчыны, клён (явар) – хлопца. Сям'я – чатыры крыжападобна спалучаныя разеткі, нярэдка ў арнаментальнай абмалёўцы.

Сучасныя майстры запазычваюць са скарбніц народнай культуры цудоўныя ўзоры, выкарыстоўваюць як старадаўнія, больш складаныя, так і новыя элементы.

**Д. Грамадскі**

## РАЗВІЦЦЁ ПРАТЭЗЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (XX–XXI ст.)

Напачатку XX ст. у беларускай мове назіралася тэндэнцыя прыкрытасці складу. Гэта значыць, што наша мова імкнецца пакідаць як мага менш непрыкрытых складоў. Дзякуючы гэтай тэндэнцыі, мы можам назіраць такую з'яву, як пратэза. Браніслаў Тарашкевіч, яшчэ не валодаючы гэтым тэрмінам, азначаў яго як «прыдыханне». Мы можам адзначыць, што правіла, створанае Тарашкевічам, адрозніваецца ад таго, якое мы выкарыстоўваем у маўленні, а менавіта: пратэза [г] прадстаўлена толькі ў словах, што паходзяць ад кораня *гэт*; адсутнасць пратэзы [г], [в] перад [а]; пратэза [в] перад у, о ведае выключэнні.

Прычыны такіх разыходжанняў маглі быць рознымі, але некаторыя здаюцца найбольш імавернымі:

1. Тарашкевіч, ствараючы сваё правіла, абапіраўся на заходнебеларускія гаворкі, што парадзіла неадпаведнасць правіла рэальнай сітуацыі.

2. Рэформа 33-га года ставіла на мэце спрасціць правілы, не ўлічваючы больш рэдкія фанетычныя асаблівасці, якія не падпарадкоўваліся сістэматыцы. Праз вузкі ўзус беларускай мовы частка лексікі, што перадавала гэтую з'яву, знікла, таму зараз мы можам назіраць толькі яе фантомы.

Намі былі правераны абедзве гіпотэзы з дапамогай дыялекталагічных слоўнікаў. Па-першае, Браніслаў Тарашкевіч не ўзяў гэтыя пратэзы, скажам, толькі з віленскіх гаворак, бо мы маем пацверджанне іх наяўнасці ў гаворках і друку дзякуючы дыялекталагічным слоўнікам Чэрвеншчыны (1929) і Віцебшчыны (1927), а таксама слоўніку «Нашай Нівы» (*вастрог*, *ваканіца*, *варха*, *вастрыць*, *гавечка*).

Актуальнасць гэтай з'явы сёння таксама мае месца. Паводле сучасных слоўнікаў і этнаграфічных даследаванняў пратэзы [г] і [в] перад [а] акрэслены як дыялектычныя з'явы заходніх гаворак Беларусі і часткі Палесся. Нам удалося падцвердзіць факт найбольшага распаўсюду гэтых пратэз як на захадзе Беларусі, так і іхнюю наяўнасць у цэнтральнай частцы краіны (*вакно*, *вакурат*, *гандарак*) (Слоўнік цэнтральных раёнаў Беларусі).

На жаль, усходняя і паўночная часткі Беларусі сціпла прадстаўлены дыялекталагічнымі слоўнікамі, што не дае права дакладна сцвярджаць пра наяўнасць ці адсутнасць там пратэзы.

Вынікам працы лічу абгрунтаванне неабходнасці разгляду варыянтнага напісання некаторых слоў, што гістарычна ўжываліся з пратэзай, напрыклад *вакно* і *вастрог*, якія і зараз актыўна сустракаюцца ў друку. Было доказана,